# З ГЛЫБІНЬ НАРОДНЫХ

## *Да 90-годдзя з дня нараджэння А. Р. ЧАРВЯКОВА*



ВЯЛІКІ КАСТРЫЧНІК абудзіў да жыцця велізарныя творчыя сілы шырокіх народных мас. З іх асяроддзя вылучыліся тысячы самаадданых барацьбітоў за народнае шчасце, таленавітых арганізатараў і кіраўнікоў сацыялістычнага будаўніцтва. Да гэтай плеяды належаў і слаўны сын беларускага народа А. Р. Чарвякоў, які амаль семнаццаць гадоў узначальваў Цэнтральны выканаўчы камітэт БССР. З яго імем звязана нямала яркіх старонак у гісторыі нашай рэспублікі.

Нарадзіўся Аляксандр Рыгоравіч 8 сакавіка 1892 года ў невялікай вёсцы Дукорка цяпер Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці. Бацька яго ў маладосці батрачыў, пазней паехаў на заработкі ў Вільна.

Сям'я рабіла ўсё, каб старэйшы сын мог атрымаць адукацыю. Аляксандр вучыўся спачатку ў двухкласнай школе, потым—у гарадскім вучылішчы. Быў, як кажуць, прагны да ведаў. Але ўжо з 14 гадоў прыйшлося здабываць самому сродкі на жыццё і вучобу падзённай работай, перапіскай папер, урокамі.

Пасля самастойнай падрыхтоўкі юнак экстэрнам вытрымаў экзамены на званне настаўніка і тры гады працаваў у сельскіх школах. Займаўся не толькі навучаннем дзяцей, але і быў дарадчыкам, абаронцам, хадайнікам па справах іх бацькоў.

Паступіўшы затым у Віленскі настаўніцкі інстытут, А. Р. Чарвякоў прымае ўдзел у рабоце прагрэсіўнага таварыства «Веды». На гэта звярнула ўвагу ўсебачачае вока трэцяга аддзялення. У адным з рашэнняў педагагічнага савета аб ім пісалі: «Здольны і талковы, але захапляецца чытаннем крамольнай літаратуры».

У хуткім часе пасля заканчэння інстытута малады настаўнік быў прызван у царскую армію. Тут ён блізка сыходзіцца з рэвалюцыйна настроенымі салдатамі і афіцэрамі. У 1917 годзе, з'яўляючыся камандзірам роты другога кулямётнага палка, удзельнічае ў Лютаўскай рэвалюцыі ў Петраградзе. У маі таго ж года ўступае ў партыю бальшавікоў і назаўсёды звязвае з ёй свой лёс. Па даручэнню партыйнай ячэйкі становіцца лектарам па палітычных пытаннях у сваёй роце, а затым—у палку.

Аляксандр Рыгоравіч згуртоўваў пад бальшавіцкім сцягам рэвалюцыйныя сілы салдат і бежанцаў-беларусаў, якія аказаліся ў гады вайны ў Петраградзе і яго ваколіцах. У час Кастрычніцкага ўзброенага паўстання выконваў заданні Петраградскага партыйнага камітэта. Сфарміраваны ім атрад з салдат і рабочых прыняў удзел у баях з контррэвалюцыйнымі войскамі генерала Краснова на Пулкаўскіх вышынях.

У лютым 1918 года А. Р. Чарвякоў — камісар па беларускіх справах пры Саўнаркоме РСФСР, у жніўні—камісар дывізіі, а затым начальнік культурна-асветнага аддзела Усерасійскага бюро ваенных камісараў. Адначасова вёў вялікую партыйную работу ў Цэнтральным бюро беларускіх секцый ЦК РКП(б).

Бальшавік-ленінец, ён прымаў самы актыўны ўдзел у стварэнні і абвяшчэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. 30—31 снежня 1918 года ў Смаленску праходзіла работа VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі, якую прадстаўлялі амаль 18 тысяч камуністаў Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай, Смаленскай, часткі Віленскай і Чарнігаўскай губерняў. У ёй удзельнічаў накіраваны з Масквы ў саставе групы партыйцаў-беларусаў Аляксандр Рыгоравіч. Канферэнцыя абвясціла сябе Першым з'ездам Кампартыі Беларусі, прыняла рэзалюцыю аб утварэнні БССР. Апублікаваны 1 студзеня 1919 года маніфест Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада ў ліку іншых падпісаў і А. Р. Чарвякоў. Ён быў назначан народным камісарам асветы.

Велізарная стваральная работа Савецкай улады на тэрыторыі рэспублікі была сарвана наступленнем войск буржуазна-памешчыцкай Польшчы. У перыяд інтэрвенцыі Аляксандр Рыгоравіч знаходзіўся у 16-й арміі, працаваў у Палітупраўленні Заходняга фронту. Затым узначальваў Мінскі губрэўком, уваходзіў у састаў Літоўска-беларускага аддзела пры ЦК РКП(б), быў старшынёй Беларускага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта.

13—17 снежня 1920 года ў Мінску праходзіў II Усебеларускі з'езд Саветаў. Яго рашэнні былі накіраваны на ўмацаванне Савецкай улады ў Беларусі, аднаўленне народнай гаспадаркі рэспублікі. На I сесіі ЦВК БССР, якая адбылася пасля з'езда, А. Р. Чарвякоў быў выбран Старшынёй Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і зацверджан Старшынёй Савета Народных Камісараў.

Пераадоленне вынікаў вайны, барацьба з разрухай супалі з цяжкім бедствам—засухай на паўднёвым усходзе краіны. Аляксандр Рыгоравіч узначаліў камісію ЦВК БССР па аказанню дапамогі галадаючым Паволжа. Беларусь дзялілася з імі збожжам, насеннем. Працоўныя рэспублікі прымалі да сябе тысячы дзяцей з пацярпеўшых раёнаў.

З велізарнымі цяжкасцямі сустрэлася краіна пры вырашэнні складаных задач аднаўлення народнай гаспадаркі. Усё больш настойліва паўставала пытанне аб неабходнасці аб'яднаць сілы і рэсурсы брацкіх народаў. Беларуская рэспубліка была ў ліку ініцыятараў стварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, а А. Р. Чарвякоў актыўна ўдзельнічаў у яго нараджэнні.

Стварэнне СССР адкрыла шырокія перспектывы для сацыялістычных пераўтварэнняў, дзяржаўнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў Беларусі. К канцу 1925 года разбураная вайной народная гаспадарка рэспублікі была ў асноўным адноўлена.

Сацыялістычная індустрыялізацыя і на яе аснове рэканструкцыя народнай гаспадаркі станавіліся галоўнай задачай у пабудове сацыялізму. IX з'езд КП(б)Б, які адбыўся ў снежні

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

**А. НЯТЫЛЬКІН,**
старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, доктар гістарычных навук.
(БЕЛТА).